**Мацвеенка, М.** Лясны фронт / М. Мацвеенка // Герой працы (Шуміліна). – 1974. – 2 ліп. – С. 2.

## ЛЯСНЫ ФРОНТ

Шмат слаўных старонак у летапіс Вялікай Айчыннай вайны ўпісалі беларускія партызаны. Ні дня не ведаў вораг спакою на акупіраванай тэрыторыі. Значны ўклад у агульную справу барацьбы з нямецка-фашысцкімі захопнікамі ўнеслі і партызаны нашай брыгады.

Ішоў суровы 1943 год. Наша брыгада, у якой я выконваў абавязкі начальніка штаба, размяшчалася на тэрыторыі Сіроцінскага раёна. У канцы жніўня атрымалі загад аб правядзенні вельмі важнай і адказнай аперацыі. Трэба было разбурыць чыгуначнае палатно на ўчастку Сіроціна – Обаль. Адразу прыступілі да выканання пастаўленай задачы. Кожнаму атраду далі канкрэтныя заданні. Баявыя дзеянні пачаліся ў дакладна вызначаны час і прайшлі паспяхова. Нягледзячы на жорсткае супраціўленне, аказанае ворагам, брыгада сваю баявую задачу выканала. За адну ноч было разабрана пяць кіламетраў двухкалейнай чыгункі, і рух паяздоў на гэтым участку спыніўся на трое сутак.

З пачаткам актыўных дзеянняў Чырвонай Арміі на віцебскім напрамку нямецкае камандаванне вельмі важнае значэнне надавала чыгунцы Полацк – Маладзечна, па якой перавозіліся грузы да лініі фронту. Уздоўж чыгуначнага палатна тут былі размешчаны варожыя гарнізоны. Але гэта не ратавала гітлераўцаў. Партызаны дапамагалі Чырвонай Арміі граміць ворага, знішчалі яго камунікацыі, наносілі нечаканыя ўдары па нямецкіх часцях, якія рухаліся ў бок фронту, разбуралі чыгунку і шасейныя дарогі, пускалі пад адхон варожыя эшалоны, узрывалі чыгуначнае палатно і масты.

У пачатку 1944 года наша брыгада зноў атрымала загад, які абавязаў падарваць чыгуначнае палатно ў раёне станцый Зябкі – Падсвілле. Камандаванне атрадаў правяло разведку на тых участках чыгункі, дзе меркавалася ажыццявіць дыверсію. Былі выдзелены флангавыя заслоны і ўдарна-падрыўныя групы. Перад кожным з шасці атрадаў паставілі канкрэтную задачу. На зыходны рубеж усе атрады прыбылі своечасова. Немцы, якія ахоўвалі чыгунку, заўважылі партызан вельмі позна. У час бою народныя мсціўцы прарваліся да чыгуначнага палатна і пачалі ўзрываць рэльсы. Зямля ўздрыгвала ад шматлікіх выбухаў. Партызаны адыйшлі толькі тады, калі скончылася ўзрыўчатка. Рух на чыгунцы спыніўся на чэцвера сутак.

Аб баявых справах нашай брыгады можна расказваць многа. Мне хочацца прывесці некалькі вытрымак з дзённіка баявых аперацый. Калі перачытваеш гэтыя кароткія запісы, яшчэ раз пераконваешся, што і ў варожым тыле быў свой, лясны фронт. І тут людзі рабілі ўсё для таго, каб наблізіць перамогу.

«…16 лютага 1944 года. Дыверсійнай групай атрада “Грозны” на чыгунцы Полацк – Маладзечна, у раёне вёскі Баравыя, з супрацьтанкавага ружжа падбіта тры паравозы праціўніка. Ружэйна-кулямётным агнём абстраляны вагоны з жывоё сілай…»

«…18 лютага 1944 года група партызан атрада “Грозны” на ўчастку чыгункі Полацк – Маладзечна, у раёне вёсак Доўгае і Хвошчава, знішчыла два паравозы і цыстэрну з гаручым, абстраляла вагоны з жывой сілай…»

«…10 сакавіка 1944 года. Дыверсійная група і стралковае аддзяленне атрада “За Перамогу” ў раёне вёскі Піскунова на ўчастку чыгункі Полацк – Маладзечна пашкодзіла паравоз, эшалон абстралялі ружэйна-кулямётным агнём. Знішчана адзінаццаць аўтамашын праціўніка…»

«…29 сакавіка 1944 года. Падрыўнікі атрада імя Чапаева на ўчастку чыгункі Полацк – Маладзечна ўзарвалі воінскі эшалон. Разбіты паравоз і трынаццаць вагонаў з жывой сілай. Забіта і паранена да сотні гітлераўцаў…»

Так змагаўся беларускі народ, які не схіліў сваёй гордай галавы перад ворагам.

Арганізатарамі і натхняльнікамі партызан з’яўляліся падпольныя партыйныя камітэты і пярвічныя партыйныя арганізацыі. Камуністы і камсамольцы заўсёды ішлі ў першых радах адважных барацьбітоў за свабоду Радзімы. Яны паказвалі прыклад мужнасці і беззапаветнай адданасці справе Камуністычнай партыі.

**М. МАЦВЕЕНКА**

**былы начальнік штаба партызанскай брыгады імя Кароткіна**